


**Мы ніколі не ўспрымалі брэнд Беларусі як нейкі прадукт, які мае завершаныя формы і які можна памераць у кілаграмах ці сантыметрах. Гэта дынамічная сістэма, якая пастаянна мяняецца...**

СТАР 2



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**



**Здаровае харчаванне — гэта атрыманне з ежай усіх тых рэчываў, якія неабходны нашаму арганізму для нармальнага функцыянавання. Вялікае значэнне маюць прапорцыі тых ці іншых прадуктаў.**

СТАР 8


*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 кастрычніка 2012 г. ПЯТНІЦА № 203 (27318) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## БЕЛАРУСЬ ПАДЗЕЛІЦЦА З КУБАЙ ВОПЫТАМ РЭФАРМАВАННЯ ЭКАНОМІКІ

**БЕЛАРУСЬ гатова прыняць актыўны ўдзел у мадэрнізацыі кубінскай эканомікі. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 18 кастрычніка на сустрэчы з намеснікам старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Куба Марына Мурыльё, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, візіт кубінскай дэлегацыі ў Беларусь накіраваны на развіццё дамоўленасцяў паміж кіраўнікамі дзвюх дзяржаў, дасягнутых у ходзе нядаўняга афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Рэспубліку Куба. «Тады мы дамовіліся, што ў Беларусь прыбудзе кубінская дэлегацыя і мы разгледзім усе пытанні, якія будуць пастаўлены перад намі кіраўніком гэтай дэлегацыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Ведаю, што кіраўніцтва Кубы зацікавілася напрамкамі развіцця і сістэмай рэфармавання нашай эканомікі. І я абяцаў Раулю Кастра, што мы пакажам і раскажам усё, што робім у Беларусі. І калі вам той ці іншы напрамак будзе цікавы, мы абавязкова будзем удзельнічаць у рэалізацыі гэтага на кубінскай тэрыторыі па аналогіі з Венесуэлай», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У прыватнасці, адной са сфер, у якой можна ажыццяўляць узаемавыгаднае супрацоўніцтва, з'яўляецца сельская гаспадарка. Яе развіццё на Кубе з'яўляецца адным з прыярытэтаў у працэсе мадэрнізацыі эканомікі ў цэлым. «Для таго каб мадэрнізаваць сельскую гаспадарку, у Кубы ёсць вялікія рэсурсы. Гэта не менш як $1,5 млрд., якія Куба штогод траціць на імпарт прадуктаў харчавання і ўсяго іншага, што звязана з развіццём сельскай гаспадаркі. Лічу, што скарачэнне гэтай сумы на адну-дзве сотні мільёнаў долараў кожны год і іх замяшчэнне вытворчасцю адпаведных тавараў на Кубе было б добрай крыніцай фінансавання і набыцця тэхнікі, і стварэння кааператываў, фермерскіх гаспадарак», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Мы гатовы ўлічыць усе вашы пажаданні і дзейнічаць у гэтым напрамку», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

**БЕЛТА.**

■ Парламенцкі дзённік

## «АБНОЎЛЕНЫ ДЭПУТАЦКІ КОРПУС ПРЫЎНЯСЕ Ў ПРАЦУ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НОВЫЯ ІДЭІ»

### Палата прадстаўнікоў пятага склікання правяла першае пасяджэнне

Першае пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу новага склікання адбылося ўчора. Па звестках рэгістрацыі, на яго прыбылі 108 дэпутатаў са 109 абраных на выбарах. Нагадаем, што па выніках выбараў было абрана 109 дэпутатаў са 110 (у Гомельска-Навабеліцкай выбарчай акрузе № 36 кандыдат не быў выбраны, бо не атрымаў падтрымкі неабходнай колькасці выбаршчыкаў).

СТАР 2

Фота Пятра ФАМІНА.



# ЗАЛАТЫ ВАЛ

## Запозненае бабіна лета чакаецца ў Беларусі на выхадных

**ПАВОДЛЕ слоў галоўнага сіноптыка Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людмілы Парашчук, сённяшняе надвор'е ў поўнай меры адпавядае позняму бабінаму лету.**

У трапасферы адбываецца буйнамаштабны вынас трапічнага цяпла з Міжземнамор'я. У апошнія дні сярэднясутачная тэмпература на 4-9 градусаў перавышае кліматычную норму. Такія тэмпературы больш адпавядаюць канцу верасня.

Сёння «кіраваць» надвор'ем будзе антыцыклон, таму істотных ападкаў у Беларусі не чакаецца. Ноччу і ў першай палове дня ў некаторых раёнах згусціцца туман. Вецер будзе паўднёвы 3-8 метраў за секунду, днём па захадзе яго парывы дасягнуць 12 метраў у секунду. Тэмпература паветра ўначы складзе 1-6 градусаў цяпла, месцамі чакаюцца замаразкі да нуля — мінус 2. Днём тэмпература будзе ад плюс 12 градусаў на паўночным усходзе да плюс 18 на паўднёвым захадзе краіны.

У суботу і нядзелю сітуацыя ў атмасферы не зменіцца. У выхадныя ападкаў у краіне не чакаецца. У начны і ранішні час месцамі згусціцца туман. Уначы тэмпература паветра складзе 3-8 градусаў са знакам плюс. Днём паветра прагрэецца да 13-18 градусаў.

У пачатку наступнага тыдня ў многіх раёнах краіны захаваецца вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі да паўночных раёнаў наблізіцца атмасферны фронт. У сувязі з гэтым у панядзелак, 22 кастрычніка, у многіх раёнах Беларусі ападкаў не прагназуецца, толькі днём па поўначы Віцебскай вобласці магчымы невялікі кароткачасовы дождж. У начны і ранішні час месцамі па краіне згусціцца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3-10 градусаў. Днём тэмпература паветра будзе вагацца ад 10 градусаў цяпла па поўначы да плюс 17 на поўдні краіны.

У аўторак, 23 кастрычніка, праз тэрыторыю Беларусі з поўначы на поўдзень будзе перамяшчацца малаактыўны атмасферны фронт. Як распавяла галоўны сіноптык, дажджоў ён прынясе няшмат, але чакаецца некаторае паніжэнне тэмпературы. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах згусціцца туман. Вецер паўночна-заходні 4-9 метраў за секунду. Уначы тэмпература паветра будзе 4-9 градусаў цяпла, у паўночных раёнах начная тэмпература складзе ўсяго 0 — мінус 2 градусы. Днём паветра прагрэецца ад 6 градусаў па поўначы да 13 па поўдні краіны.

Услед за атмасферным фронтам ўмовы надвор'я ў краіне пачне фарміраваць іншы антыцыклон, які сфарміраваўся ўжо ў больш прахладным паветры над Скандынаўскім паўвостравам. Пад яго ўплывам у сераду, 24 кастрычніка, ападкаў у Беларусі не прагназуецца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1-6 градусаў цяпла, па поўначы краіны да 0 — мінус 3. Днём паветра прагрэецца да 6-13 градусаў.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Надзея ЕРМАКОВА, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:**

***«У кастрычніку Нацбанк прыняў рашэнне не змяняць стаўку рэфінансавання — не павышаць і не зніжаць яе. Не выключана, што калі трэба будзе зрабіць больш жорсткай грашова-крэдытную палітыку, то прыйдзецца стаўку і павысіць, для таго каб дзесьці не было нейкіх рэзкіх ваганняў і каб лішнія грошы не ішлі на валютны рынак».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 16° |
| Віцебск | + 14° |
| Гомель | + 15° |
| Гродна | + 15° |
| Магілёў | + 13° |
| Мінск | + 14° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.10.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8520,00 | ▼ |
| Еўра | 11150,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 277,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1043,99 | ▼ |

## БЕЛАРУСЬ ЧАКАЕ ПРАБАЧЭННЯЎ...

**Беларускі бок мае поўнае маральнае права чакаць як мінімум прабачэнняў у сувязі з інцыдэнтам са шведскім самалётам. Аб гэтым заявіў ўчора журналістам начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных, адказваючы на пытанне БЕЛТА.**

Паводле слоў афіцыйнага прадстаўніка знешнепалітычнага ведамства, шведскі самалёт наўмысна парушыў паветраную прастору Беларусі, і гэта па міжнародных законах — злачынства. «Мы накіравалі адпаведныя запыты аб аказанні прававой дапамогі шведскім уладам і не атрымалі адказаў», — падкрэсліў ён.

«Сітуацыя выглядае дзіўна. Прадстаўнікі ЕС хутка даюць ацэнкі дзеянням урадаў замежных дзяржаў, калі лічаць, што яны не адпавядаюць іх прынцыпам. У сітуацыі са шведскім самалётам усё відавочна — учынена злачынства. А ў адказ цішыня. Заходнія ўрады як у рот вады набралі. Атрымліваецца, што краіны Захаду заахвочваюць сваіх грамадзян на ўчыненне злачынстваў на тэрыторыі іншых дзяржаў пад прыкрыццём паліткарэктных лозунгаў? Як гэта разумець?» — падкрэсліў Андрэй Савіных. «Ці можам мы гаварыць у гэтым кантэксце аб такой з'яве, як заходні фундаменталізм?» — заўважыў афіцыйны прадстаўнік МЗС.

## АНДРЭЙЧАНКА Уладзімір Паўлавіч
## СТАРШЫНЯ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



Андрэйчанка Уладзімір Паўлавіч нарадзіўся ў 1949 г. у в. Мар'янова Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. У 1977 г. скончыў Велікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут (Расія), у 1988 г. — Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1968 г. пасля заканчэння Лужаснянскага сельгастэхнікума аграномам калгаса «Перамога сацыялізму» Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. У 1968—1970 гг. служыў у радах Савецкай Арміі. З 1970 па 1972 гг. працаваў старшым аграномам Зубкоўскага спецаддзялення «Сельгастэхніка». У 1972—1974 гг. — інструктар, загадчык арганізацыйнага аддзела Лёзненскага райкама камсамола, у 1974—1975 гг. — інструктар Лёзненскага КПБ. З 1975 па 1978 гг. быў сакратаром парткама саўгаса «Адаменкі».

У 1978—1981 гг. — старшыня калгаса імя Данукалава Лёзненскага раёна.

У 1981—1985 гг. працаваў начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі Лёзненскага райвыканкама. У 1985—1987 гг. — старшыня Лёзненскага райвыканкама. У 1987—1991 гг. — першы сакратар Верхнядзвінскага райкама КПБ, старшыня Верхнядзвінскага раённага Савета народных дэпутатаў — першы сакратар Верхнядзвінскага райкама КПБ.

З кастрычніка па снежань 1991 г. працаваў першым намеснікам старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і забеспячэнні насельніцтва харчаваннем Віцебскага аблвыканкама, са снежня 1991 г. па лістапад 1994 г. — намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама, старшынёй камітэта па сельскай гаспадарцы і забеспячэнні насельніцтва харчаваннем Віцебскага аблвыканкама.

З лістапада 1994 г. па кастрычнік 2008 г. — старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР дванаццатага склікання. З'яўляўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога, трэцяга скліканняў. У кастрычніку 2008 г. выбраны старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання, у снежні 2008 г. — першым намеснікам старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. З'яўляецца членам Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы.

З 18 кастрычніка 2012 г. — старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Узнагароджаны ордэнам Айчыны II і III ступені, удастоены ганаровага звання «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь». Мае дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Нацыянальнага сходу, Савета Міністраў Беларусі.

## ГУМІНСКІ Віктар Аляксандравіч
## НАМЕСНІК СТАРШЫНІ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



Нарадзіўся 3 жніўня 1955 года ў в. Свадбічы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

Адукацыя вышэйшая — скончыў Новасібірскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча, афіцэр-палітработнік з вышэйшай адукацыяй, Ваенна-палітычную акадэмію імя К. Готвальда (ЧССР) па вышэйшай ваенна-палітычнай спецыяльнасці, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст. Палкоўнік.

Праходзіў вайсковую службу на пасадзе намесніка камандзіра роты, батальёна, палка па палітычнай часці, намесніка начальніка палітаддзела танкавай дывізіі, намесніка камандзіра танкавай дывізіі, начальніка аддзела 7-й танкавай арміі, начальніка аддзела 65-га армейскага корпуса, намесніка камандзіра па выхаваўчай рабоце 65-га армейскага корпуса Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Абіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога, трэцяга, чацвёртага і пятага скліканняў, быў членам Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы, намеснікам старшыні, старшынёй Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы, намеснікам Старшыні Палаты прадстаўнікоў.

18 кастрычніка 2012 года абраны Намеснікам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

З'яўляецца намеснікам старшыні савета рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», старшынёй Мінскай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь».

Узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені, ордэнам Пашаны, дзевятнаццацю медалямі СССР і Рэспублікі Беларусь, двума медалямі ЧССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Валодае чэшскай мовай.

Жанаты, мае сына і дачку.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ГРЭЦЫЯ СПЫНІЛА ПРАЦУ Ў ЗНАК ПРАТЭСТУ СУПРАЦЬ ЖОРСТКАЙ ЭКАНОМІІ



У Грэцыі 18 кастрычніка пачалася ўсеагульная 24-гадзінная забастоўка. Акцыя заклікана паралізаваць жыццё ў краіне і прадэманстраваць ураду непрымальнасць далейшых мер жорсткай эканоміі. Арганізатарамі страйку выступаюць вядучыя прафсаюзы краіны ADEDY і GSEE, якія аб'ядноўваюць прыкладна два мільёны чалавек — гэта значыць каля паловы працоўнай сілы Грэцыі. Гэта ўжо чацвёрты сутачны страйк у краіне за год. Паколькі раней аналагічныя дэманстрацыі прыводзілі да сутычак незадаволеных грэкаў з вартавымі парадку, каля парламента ўсталявалі металічныя загароджы і разгарнулі сілы паліцыі колькасцю каля чатырох тысяч чалавек. Грэцыя перажывае самы цяжкі эканамічны крызіс з часоў Другой сусветнай вайны. «Тройка» краін-крэдытораў патрабуе, у прыватнасці, прыняцця пакета мер па скарачэнні дзяржвыдаткаў на 11,5 мільярда. У ADEDY папярэдзілі, што такія меры «знішчаць рэшткі правоў на працу, пенсію і сацыяльнае забеспячэнне».

### КІРГІЗСКІЯ ДЭПУТАТЫ ЗРАБІЛІ БОЛЬШ ЖОРСТКІМ ПАКАРАННЕ ЗА КРАДЗЕЖ НЯВЕСТ



Парламент Кіргізіі ўхваліў у другім чытанні законапраект аб узмацненні адказнасці за крадзеж нявест. За прыняцце адпаведных паправак у Крымінальны кодэкс прагаласавалі 63 з 75 дэпутатаў, якія прысутнічалі на пасяджэнні. Згодна з прынятымі папраўкамі, максімальнае пакаранне за прымус жанчыны да ўступлення ў шлюб складзе сем гадоў пазбаўлення волі. У цяперашні час адпаведны артыкул КК рэспублікі «Прымус жанчыны да ўступлення ў шлюб або перашкода ўступленню ў шлюб» прадугледжвае толькі тры гады турмы. У выпадку выкрадання непаўналетняй пакаранне складзе да 10 гадоў пазбаўлення волі. Па звестках амбудсмена Кіргізіі, штогод у краіне выкрадаюць ад 15 да 16 тысяч нявест з мэтай прымусова выдаць іх замуж.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ДАКЛАД HRW АБВЕРГ АФІЦЫЙНУЮ ВЕРСІЮ ГІБЕЛІ КАДАФІ

Міжнародная праваабарончая арганізацыя Human Rights Watch (HRW) да гадавіны забойства ў Лівіі 20 кастрычніка 2011 года захопленага паўстанцамі лідара краіны Муамара Кадафі апублікавала новыя доказы зверстваў рэвалюцыянераў. У 50-старонкавым дакладзе адзначаецца, што лівійскія ўлады не выканалі сваё абяцанне расследаваць абставіны смерці кіраўніка Джамахірыі, яго сына Мутасіма і дзясяткаў іх пакараных прыхільнікаў .

Паводле інфармацыі HRW, пасля таго як Кадафі і члены яго канвою з паўсотні машын былі захоплены ў палон, іх падверглі жорсткім катаванням. 66 прыхільнікаў дыктатара, затрыманых разам з ім, былі пазней забіты. Даследчыкі высветлілі, што апазіцыянеры даставілі параненага сына Кадафі Мутасіма з Сірта ў Місрату і там забілі. Па словах дырэктара па надзвычайных сітуацыях у HRW Піцера Букэерта, вынікі расследавання ставяць пад сумнеў заявы новых улад аб тым, што Кадафі загінуў нібыта ад выпадковай кулі ў перастрэлцы. Сярод самых сур'ёзных доказаў факта наўмыснага забойства паўстанцамі прыхільнікаў Кадафі — відэа, знятае камерай мабільнага тэлефона.

Згодна з нормамі міжнароднага права, забойства захопленых у палон лічыцца ваенным злачынствам, і лівійскія ўлады абавязаны расследаваць яго і пакараць вінаватых. Прадстаўнікі HRW паведамілі лівійскім уладам аб выніках расследавання (у прыватнасці, сталі вядомымі імёны камандзіраў паўстанцаў, якія аддалі загад расстраляць палонных), але ніякіх мер прынята не было. На думку экспертаў, даклад пагражае яшчэ больш пагоршыць рэпутацыю кіраўніцтва Лівіі ў вачах Захаду, катастрафічна падарваную нядаўнім забойствам пасла ЗША Крыстафера Стывенса ў Бенгазі.

КОРАТКА

Усяго ў Беларусі за дзевяць месяцаў 2012 года арганізацыі ўсіх форм уласнасці ўвялі ў эксплуатацыю 42,2 тыс. новых кватэр (у студзені—верасні 2011-га — 48,6 тыс.), або 3409,7 тыс. кв.м агульнай плошчы жылля (81,2 працэнта задання на год).

Сёлета ў студзені—верасні пры садзейнічанні службы занятасці на новае месца жыхарства і работы перасяліліся 283 сям'і беспрацоўных, паведамілі ва ўпраўленні палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. У тым ліку з Мінска ў правінцыю дзеля рабочага месца і жылля перасяліліся ў гэтым годзе 7 сталічных сям'яў беспрацоўных.

У Беларусі 4104 хранічныя алкаголікі ізаляваныя ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі, з іх 975 жанчын, паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Сяргей Красуцкі. Ён дадаў, што ўтрыманне такіх устаноў каштуе дзяржаве немалых выдаткаў: на ўтрыманне 6 ЛПП і 25 медыцынскіх выцвярэзнікаў толькі ў першым паўгоддзі 2012 года з рэспубліканскага бюджэту было выдаткавана каля Br40 млрд.

## ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА ІДЭІ КАНФІСКАЦЫІ ТРАНСПАРТНАГА СРОДКУ Ў НЕЦВЯРОЗЫХ ВАДЗІЦЕЛЯЎ?



**Аляксандр КАНДРАЦЕНКА, вадзіцель маршрутнага таксі і спецыяліст па бяспецы дарожнага руху адной з прыватных фірмаў:**

— Ідэя правільная. Калі канфіскацыя будзе ўведзена, кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане скароціцца нашмат. Трэба канфіскоўваць аўтамабіль і даваць буйны штраф — мільёнаў 15. Каб чалавек гэта добра запомніў. Вышэйназваная праблема вельмі актуальная, бо ў нецвярозым стане ў чалавека парушана рэакцыя, ён можа збіць пешахода і нават не заўважыць гэтага. Я бачыў п'янага кіроўцу легкавога аўтамабіля, які з-за дрэннай рэакцыі ўехаў у заднюю частку аўтобуса. Дзякаваць Богу, ніхто не пацярпеў, але калі вадзіцель выйшаў з аўто, то быў «ніякі».



**Старшы інспектар УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Станіслаў САЛАВЕЙ:**

— У першую чаргу, як супрацоўнік ДАІ, і проста як грамадзянін, я лічу, што калі ў патэнцыйнага забойцы забіраюць сродак здзяйснення злачынства, то выратоўваюць сотні жыццяў. Вопыт іншых краін паказвае, што гэта дастаткова дзейсная мера, якая знаходзіць разуменне ў грамадстве. Кожны год у нашай краіне па віне п'яных вадзіцеляў гіне больш за 200 чалавек, больш за 1000 атрымліваюць раненні. Безумоўна, гэтая лічба была б меншай, калі б у нецвярозых вадзіцеляў забіралі аўтамабіль.



**Анфім МІХАЛЕВІЧ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання:**

— Калі нецвярозы вадзіцель здзейсніў ДТЗ, якое пацягнула гібель чалавека, то акрамя пакарання, прадугледжанага Крымінальным кодэксам, адназначна трэба і канфіскоўваць аўтамабіль. Больш за тое, калі п'яны чалавек садзіцца за руль у другі раз пасля таго, як падобнае было зафіксавана супрацоўнікамі ДАІ, нават і без здзяйснення ДТЗ, варта аўтамабіль канфіскоўваць, бо гэта ўжо не выпадковасць і такі вадзіцель з'яўляецца патэнцыяльна небяспечным. Трэба змагацца не толькі з нецвярозымі вадзіцелямі, але і з нізкай культурай цвярозых. Сёння інтэнсіўнасць дарожнага руху вельмі высокая, і толькі калі ўсе будуць прытрымлівацца правілаў дарожнага руху, няшчасных выпадкаў на нашых дарогах стане менш.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАЗНАЧЫЎ СЯМЁНА ШАПІРУ ЧЛЕНАМ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ ПЯТАГА СКЛІКАННЯ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў адпаведнасці з часткай другой артыкула 91 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь назначыў старшыню Гродзенскага аблвыканкама Сямёна Шапіру членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання. Адпаведны ўказ Прэзідэнт падпісаў 18 кастрычніка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

## «АБНОЎЛЕНЫ ДЭПУТАЦКІ КОРПУС ПРЫЎНЯСЕ Ў ПРАЦУ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НОВЫЯ ІДЭІ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына, якая адкрывала першае пасяджэнне, паведаміла, што ў Палаце прадстаўнікоў новага склікання працягне працу 21 дэпутат з Палаты прадстаўнікоў папярэдняга склікання. Яна лічыць, што «абнаўленне заканадаўчага органа больш чым на 3/4 паслужыць добрым стымулам для далейшага ўдасканальвання заканадаўчай дзейнасці».

— У склад парламента абраны дастойныя прадстаўнікі беларускага народа: 47 дэпутатаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, 7 дэпутатаў маюць ганаровыя званні, 17 — вучоную ступень і вучонае званне. Сярод дэпутатаў — 29 жанчын. Дэпутацкія мандаты атрымалі прадстаўнікі 3 палітычных партый: Камуністычную партыю Беларусі прадстаўляюць тры дэпутаты, Беларускую аграрную партыю і Рэспубліканскую партыю працы і справядлівасці — па адным дэпутаце. Членамі РГА «Белая Русь» з'яўляюцца 63 дэпутаты.

Яна таксама паведаміла, што сацыяльны статус дэпутатаў розны: 34% складаюць кіраўнікі арганізацый розных сфер дзейнасці, а таксама «вялікі давер аказалі выбаршчыкі кіраўнікам мясцовых, прадстаўнічых, выканаўчых, распарадчых органаў» — у ліку дэпутатаў іх 16. Сярод дэпутатаў ёсць юрысты, эканамісты, выкладчыкі, урачы, інжынеры, аграномы, ваеннаслужачыя, а таксама прадстаўнікі іншых прафесій і адзін прызёр Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы.

— Высокі адукацыйны і прафесійны ўзровень выбраных дэпутатаў дазваляюць з упэўненасцю казаць пра тое, што Палата прадстаўнікоў новага склікання ў стане кампетэнтна выконваць ускладзеныя на яе Канстытуцыяй паўнамоцтвы, — лічыць Лідзія Ярмошына.

На першым пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў былі выбраны мандатная камісія, сакратарыят першай сесіі і падліковая камісія першай сесіі. Мандатная камісія, вывучыўшы ўсе прадстаўленыя дакументы, устанавіла, што абранне ўсіх дэпутатаў праведзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь і парушэнняў, якія б маглі паслужыць падставай для прызнання паўнамоцтваў асобных дэпутатаў несапраўднымі, не выяўлена. Таксама быў выбраны і старшыня Палаты прадстаўнікоў. Ім стаў Уладзімір Андрэйчанка. Яго кандыдатура была адзінай на пост старшыні (канкурэнтаў вылучана не было), і большасцю галасоў (105 са 108 прысутных, 3 бюлетэні былі прызнаны несапраўднымі, бо дэпутаты замест таго, каб закрэсліць адзін з варыянтаў «за» ці «супраць», абводзілі іх у кружочкі ці ставілі «птушкі») Уладзімір Андрэйчанка стаў старшынёй Палаты прадстаўнікоў. Нагадаем, што ў Палаце прадстаўнікоў мінулага склікання ён займаў гэты ж пост.

У сваім выступленні перад дэпутатамі Уладзімір Андрэйчанка акрэсліў асноўны спектр пытанняў, якімі прыйдзецца займацца дэпутацкаму корпусу 5-га склікання:

— Усе мы добра ўяўляем маштабы і значнасць задач, якія стаяць перад дэпутацкім корпусам пятага склікання. Яны выцякаюць з установак кіраўніка дзяржавы новаму складу парламента: Прэзідэнт на першы план паставіў заканадаўчае забеспячэнне рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011-2015 гг. Гэта будзе наш дэпутацкі ўнёсак у дасягненне галоўнай мэты — павышэнне дабрабыту і якасці жыцця беларускага народа.

Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што асаблівую ўвагу дэпутатам варта звярнуць на законапраекты, накіраваныя на паскарэнне тэмпаў развіцця краіны, мадэрнізацыю эканомікі:

— Далейшых заканадаўчых крокаў патрабуе падтрымка малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, стварэнне высокаэфектыўных працоўных месцаў. Ужо падчас першай сесіі мы павінны завяршыць працу над праектамі законаў аб камерцыйнай тайне, інвестыцыях, бухгалтарскім уліку і справаздачнасці, максімальна напоўніўшы іх нормамі прамога дзеяння. Гэтыя законы павінны быць законамі новага пакалення.

Таксама, на думку старшыні Палаты прадстаўнікоў, дэпутатам трэба ўключыцца ў падрыхтоўку законапраекта наконт дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў розных сферах эканомікі, і звярнуць увагу на блок законапраектаў, якія рэгулююць пытанні аграрнага сектара, прыняць удзел у распрацоўцы Кодэкса «Аб культуры», падключыцца да правядзення маніторынгу эфектыўнасці Кодэкса «Аб адукацыі», Закона аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб.

— Менавіта дэпутаты, якія на прамую працуюць з выбаршчыкамі, могуць «намацаць болевыя кропкі» і ўнесці прапановы па павышэнні дзейснасці іх нормаў, — лічыць Уладзімір Андрэйчанка.

Ён дадаў, што дэпутатам Палаты прадстаўнікоў новага склікання трэба будзе завяршыць маштабную працу па заканадаўчым забеспячэнні Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы і будаваць стасункі з іншымі рэгіёнамі свету:

— Актуальнай застаецца задача развіцця дыялогу з еўрапейскімі парламенцкімі структурамі. Мы павінны выкарыстоўваць усе магчымасці для дасягнення прагрэсу ў гэтым кірунку. Разам з тым, трэба рашуча спыняць любыя спробы размаўляць з намі з пазіцыі сілы. Сярод найважнейшых прыярытэтаў міжнароднага супрацоўніцтва (як у шматбаковым, так і ў двухбаковым фарматах) — нарошчванне актыўнасці ў такіх перспектыўных для нас рэгіёнах свету, як Паўднёва-Усходняя Азія, Лацінская Амерыка, Афрыка.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў узгадаў, што, выступаючы перад парламентарыямі, кіраўнік дзяржавы асаблівы акцэнт зрабіў на ўзмацненні адкрытасці і галоснасці парламенцкага працэсу. Таму ён прапануе аднавіць прамыя трансляцыі пасяджэнняў парламента на тэлебачанні і выкарыстоўваць магчымасці інтэрнэту:

— Палата прадстаўнікоў павінна стаць аўтарытэтнай пляцоўкай для грамадскіх дыскусій па найбольш важных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця краіны. Таму я мяркую, што мэтазгодна ўключыць у парадак дня пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў раздзел «Рознае», дзе мы маглі б абмяркоўваць найбольш вострыя праблемы ўнутранай і знешняй палітыкі. Трэба выходзіць на прамую трансляцыю такіх дыскусій, аднавіць на тэлебачанні праграму «Парламенцкая гадзіна». Варта шырэй выкарыстоўваць магчымасці інфармацыйных тэхналогій, у тым ліку інтэрнэту. Бо менавіта ў гэты сегмент інфармацыйнай прасторы ўсё больш перамяшчаецца цэнтр грамадскіх дыскусій па самых розных пытаннях. Асабліва гэта тычыцца моладзі — найбольш актыўнай часткі грамадства, і важна дапамагчы маладому пакаленню знайсці сябе, рэалізаваць свае сілы ў грамадска-палітычнай дзейнасці. У гэтым плане сваю станоўчую ролю можа адыграць практычная рэалізацыя ідэй моладзевага парламента.

Напрыканцы свайго выступлення Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што ў новага складу дэпутацкага корпуса высокі патэнцыял:

— На працягу ўсёй дзейнасці парламент з'яўляўся адной з важнейшых апор палітычнай стабільнасці, захавання спакою і міру ў краіне. І наша агульная задача — дастойна працягнуць выкананне гэтай высокай місіі.

Быў выбраны і намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў. Ім стаў дэпутат Віктар Гумінскі, які балатаваўся ў Палату прадстаўнікоў па Барысаўскай сельскай акрузе № 63. Выступаючы перад калегамі, ён адзначыў, што асаблівую ўвагу трэба надаць правапрымяняльнай практыцы, бо «гэта значны фактар росту ў прафесійнай дзейнасці дэпутатаў». Таксама ён лічыць, што трэба пашыраць формы працы са СМІ, каб больш аператыўна адгукацца на патрабаванні жыцця. Што тычыцца міжнароднай дзейнасці, то, на думку Віктара Гумінскага, беларускаму парламенту трэба больш эфектыўна выкарыстоўваць удзел беларускага боку ў розных міжпарламенцкіх структурах для адстойвання і прасоўвання інтарэсаў краіны — прычым гэта тычыцца не толькі тых структур, дзе беларускія парламентарыі працуюць даўно, але і Міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН, дзе статус назіральніка быў атрыманы толькі нядаўна.

Дэпутаты зацвердзілі і рашэнне па колькасці і назвах пастаянных камісій — іх будзе 14, як і ў папярэднім скліканні, але і назвы трохі памяняліся: па заканадаўстве; па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; па нацыянальнай бяспецы; па эканамічнай палітыцы; па бюджэце і фінансах; па аграрнай палітыцы; па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы; па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ; па адукацыі, культуры і навуцы; па працы і сацыяльных пытаннях; па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы; па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве, па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі; па міжнародных справах.

Першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання працягне працу 23 кастрычніка — у гэты дзень дэпутатам трэба будзе абраць старшынь пастаянных камісій і іх персанальны склад.

**Іван СТУЖКА.**

■ Блізкая ўлада

# «КАЛІ ГРОШАЙ НЯМА — ТАК І СКАЖЫЦЕ...»

**Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Віцебскай вобласці Мікалай Дамашкевіч — падчас тэлефоннай «прамой лініі» выслухаў каля сарака жыхароў Віцебшчыны. Ён парэкамендаваў аблвыканкаму (абапіраючыся на свой уласны вопыт былога старшыні Мінскага аблвыканкама) на кожным пасяджэнні заслухоўваць у першую чаргу пытанне аб разглядзе зваротаў грамадзян.**



Фота БЕЛТА.

Жыхарка абласнога цэнтра расказала, што яшчэ зімой 2010-га падчас «прамой лініі» асабіста губернатар паабяцаў ёй, што ў доме будзе праведзены капітальны рамонт. Але і цяпер яшчэ жыльцы чакаюць, калі ён пачнецца. Гараджанка засялілася ў дом яшчэ ў 1967 годзе. Камунальных праблем хапае. Напрыклад, дом стаіць у нізіне, дзе збіраецца вада, у кватэрах вільготна і холадна. Чаму не выконваецца абяцанне губернатара? Памочнік Прэзідэнта адзначыў, што гэта прыклад таго, як нельга працаваць з людзьмі. Фактычна адказныя асобы «падставілі» старшыню аблвыканкама, які даў падначаленым адпаведнае даручэнне дапамагчы людзям. Мікалай Дамашкевіч даручыў стварыць рабочую групу, каб урэшце пачалі рамонт.

Жыхарка вёскі Камунарка Віцебскага раёна паскардзілася на дрэнны стан сельскай дарогі. Паводле яе слоў, існуюць транспартныя праблемы. А замест таго, каб вырашыць іх, транспартнікі спасылаюцца на дарожнікаў, апошнія на першых.

Вельмі неардынарнай была скарга ад віцябчанкі, бабулі трох унукаў. Яе дачка з дзецьмі пражывае ў аграгарадку Ноўка ў катэджы. З мужам жанчына развялася, і цяпер кіраўніцтва гаспадаркі паставіла яе перад фактам: паколькі былы муж у гаспадарцы больш не працуе, трэба высяляцца з дома. Але куды ёй ісці? Памочнік Прэзідэнта паабяцаў, што жанчыне абавязкова акажуць дапамогу і зробяць усё магчымае, каб сям'я засталася жыць у «прэзідэнцкім» доме.

Таксама даволі неардынарным быў зварот ад жанчыны з Віцебска, якая выхоўвае адно роднае дзіця і трох прыёмных. І хоча яшчэ ўзяць дзяцей. Ёсць у яе патрэба ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Жанчына ў свой час ужо звярталася да ўлад. Паабяцалі, што пабудуюць дом. СМІ напісалі пра гэта. Ды, відаць, грошай у бюджэце не знайшлося... Гэтай сям'і таксама дапамогуць.

Адразу дзве жыхаркі Віцебска агучылі праблему даўгабуда іх дома. Цэны на квадратныя метры павялічваюцца, а дом не будуецца. Высветлілася, што былы генеральны падрадчык не справіўся з задачай будаўніцтва. Цяпер там працуюць рабочыя іншай арганізацыі, з добрай рэпутацыяй і аўтарытэтам.

Вельмі нечаканае пытанне задала маці мужчыны, якога пазбавілі волі тэрмінам на 23 гады. Нягледзячы на тое, што сын доўгі час у кватэры жыць не будзе, усё роўна трэба плаціць за ацяпленне і карыстанне ліфтам. Аказваецца, калі за чалавекам «замацаваныя» квадратныя метры, трэба плаціць за камфорт. Дадзена заданне разабрацца і дапамагчы.

Адзін з тых, хто патэлефанаваў на «прамую лінію», запытаў памочніка Прэзідэнта: што трэба зрабіць, каб віцебская футбольная каманда вярнулася ў вышэйшую лігу? Мікалай Дамашкевіч пажартаваў, што, бадай, гэта толькі адно пытанне, якое знаходзіцца ў кампетэнцыі памочніка кіраўніка дзяржавы. І падзяліўся думкамі наконт таго, што трэба рабіць, каб віцебскія футбалісты былі сярод самых моцных у краіне.

Даволі незразумелая сітуацыя склалася ў пасёлку Опса Браслаўскага раёна. Сям'я вымушана будзе выселіцца з прыватызаванага дома, бо ён знаходзіцца на тэрыторыі былой панскай сядзібы, якую прадалі інвестару. Купіла сядзібу мінская фірма, а гаспадароў папярэдзілі, што ім трэба шукаць новае жыллё. Прапанавалі кампенсацыю — усяго 38 мільёнаў рублёў. А за гэтыя грошы якое жыллё цяпер купіш? Дадзена даручэнне не пакінуць людзей у бядзе...

— Я ў мінулы раз пасля прыёму грамадзян пахваліў віцебскіх кіраўнікоў. А сёння падчас «прамой лініі» падумаў, а ці трэба іх наогул хваліць? Пытанні, якія задавалі людзі, актуальныя, іх трэба вырашаць: рамонт жылля, дарог, архітэктурная планіроўка, межы зямельных участкаў... Насцярожвае, што яны не вырашаюцца адпаведнымі службамі, — падвёў вынікі «прамой лініі» памочнік Прэзідэнта. — Раённыя і гарадскія службы прывыклі да таго, што ім павінны зверху дасылаць праблемную інфармацыю пасля прыёму грамадзян. Сёння ў мяне з'явілася глыбокая ўпэўненасць, што нам трэба на абласным узроўні, на ўзроўні памочніка Прэзідэнта прааналізаваць, як жа раённыя і гарадскія кіраўнікі працуюць з насельніцтвам, паколькі столькі пытанняў узнікае.

Што датычыцца адной з самых актуальных праблем — рамонту жыллёвага фонду, на думку памочніка Прэзідэнта, трэба зацвердзіць планы правядзення работ. Зразумела, хутка адрамантаваць старыя дамы, якім дзясяткі гадоў, нерэальна. Але не трэба цягнуць час. І рамантаваць у першую чаргу самыя старыя дамы.

— Калі працуем з насельніцтвам, не трэба людзей падманваць. Калі грошай няма, так і скажыце, і раскажыце, колькі грошай ёсць, і ў выніку чалавек не будзе крыўдзіцца, — працягвае Мікалай Дамашкевіч, — а будзе адчуваць справядлівы падыход. Не назіраць трэба, а тлумачэнні даваць... Здараецца, што няма ўзаемадзеяння абласных кіраўнікоў паміж сабой. Хіба гэта не пытанне для далейшай працы?..

**Аляксандр ПУКШАНСКІ** ■

# ІМІДЖ БЕЛАРУСІ:
## ШТО ВЕДАЮЦЬ ПРА НАС У СВЕЦЕ?

**МІЖНАРОДНЫ форум «Імідж Рэспублікі Беларусь: час дзейнічаць» пройдзе ў пачатку снежня ў Мінску. Гэтае мерапрыемства ладзіцца трэці год запар і ставіць перад сабой мэту выявіць цікавыя ініцыятывы і праекты, якія б прасоўвалі Беларусь у розных напрамках. Сёлета на форуме пройдуць тры секцыйныя пасяджэнні: «Турызм і пазіцыянаванне гарадоў», «Камунікацыі: каналы і тэхналогіі», «Міжнародны гандаль і інвестыцыі». Акрамя таго, падчас форуму пройдзе конкурс творчых работ — будуць абмеркаваны і выбраны лепшыя працы ў намінацыях «Беларусь турыстычная», «Чэмпіянат свету па хакеі 2014», «Беларусь падзейная», «Прасоўванне гарадоў і рэгіёнаў», «Зроблена ў Беларусі». Дарэчы, яшчэ ёсць шанц прыняць удзел у конкурсе — працы прымаюцца да 23 лістапада.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Напярэдадні форуму арганізатары правялі прэс-канферэнцыю, дзе расказалі пра сваё бачанне важнасці стварэння станоўчага іміджу нашай краіны. Напрыклад, Анатоль АКАНЦІНАЎ, генеральны дырэктар Цэнтра стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы», арганізатар форуму, лічыць, што брэнд краіны ствараецца з асобных кавалкаў:

— Брэнд краіны — гэта ўсё-такі зборны вобраз. І ён больш устойлівы, калі ствараецца па частках: з брэндаў асобных гарадоў, брэндаў прадукцыі, брэндаў турыстычных падзей і г.д. Тады з гэтых «кавалкаў» складаецца разуменне і ўспрыняцце краіны ў цэлым.

А прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Андрэй САВІНЫХ перакананы, што брэнд краіны нельга ўзважыць ці памераць:

— Мы ніколі не ўспрымалі брэнд Беларусі як нейкі прадукт, які мае завершаныя формы і які можна памераць у кілаграмах ці сантыметрах. Справа ў тым, што гэта дынамічная сістэма, якая пастаянна мяняецца і развіваецца. І трэба, каб гэтая сістэма транслявала пазітыўны сігнал у свет.

Дарэчы, зараз даследчы цэнтр INSTID з Вялікабрытаніі займаецца распрацоўкай брэнда горада Мінска, што з'яўляецца прыкладам стварэння тэрытарыяльнага брэнда. Пра тое, як рухаецца гэта працэс і наогул навошта гораду брэнд, расказала Наташа ГРАНД, прадстаўнік кампаніі INSTID, кіраўнік праекта «Брэнд «Мінск»:

— Тое, што мы робім для Мінска — гэта самы маштабны праект тэрытарыяльнага брэндынгу ў Беларусі. Брэнд патрэбны для таго, каб ва ўмовах вельмі вялікай канкурэнцыі гарадоў і краін у свеце ўпэўнена заявіць пра сябе. Брэнд — гэта неабходнасць практычна для любога горада і краіны ў XXI стагоддзі. Бо даследаванні паказваюць, што ўзровень разумення міжнароднай публікі можна параўнаць з узроўнем увагі 8-гадовага дзіцяці, якое гуляе ў камп'ютарную гульню: вам трэба яго нечым прывабіць, даць штосьці цікавае, і пры гэтым заявіць пра сябе так, каб ён запомніў.

Па яе словах, у грамадстве распаўсюджана думка, што брэнд нібыта ствараецца для турыстаў ці для замежнай аўдыторыі. Але насамрэч гэта робіцца ў першую чаргу для саміх жыхароў:

— Брэнд — гэта пэўны адбітак, які ёсць на ўсім, што адбываецца ў горадзе — на людзях, на працэсах, на размовах, на стасунках. Каб можна было паглядзець на двух чалавек і сказаць — во гэты з Мінска, а той — не. І вялікая частка нашай працы заключаецца ў тым, каб сфармуляваць асноўную ідэю Мінска, якая ўласціва ўсяму, што адбываецца ў горадзе, і яе перадаць.

Дарэчы, мінчане і самі, здаецца, не ведаюць, якая ў горада асноўная ідэя. Бо, згодна з вынікамі праведзенага даследавання, людзі даюць вызначэнне Мінску ці ў супрацьстаўленні з вёскай, ці кажуць, што Мінск — гэта сталіца Беларусі. А паняцце, што такое Мінск сам па сабе як горад — не перададзена.

Паколькі Наташа Гранд даволі доўга жыве ў Лондане, то карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў яе: а што замежнікі ведаюць пра Беларусь і з чым яна ў іх асацыюецца? Дый ці ведаюць наогул пра такую краіну?

— Ведаеце, калі я ў 1999 годзе казала, што з Беларусі, то ўсе пыталіся, дзе гэта. Зараз, калі кажу, што з Беларусі, чакаю такое ж пытанне. Але людзі кажуць: «А, ведаю». І гэтае разуменне ёсць ужо гадоў 5-6 — пра Беларусь ведаюць. Калі браць падборку прэсы ці ў «Гугле» напісаць «Беларусь», то палова навін будзе пра спорт: Азаранка, Глеб, БАТЭ — пра іх пішуць. Так што пра Беларусь ведаюць, але пытанне ў тым, што канкрэтна ведаюць. Напрыклад, у Мінску ёсць шмат цікавых высокатэхналагічных прадпрыемстваў, і калі яны пачынаюць супрацоўнічаць з замежнымі партнёрамі, то апошнія здзіўляюцца: «Што, у Беларусі такое ёсць? Мы думалі, толькі бульба». Таму, калі мы заўсёды кажам, што ў нас толькі аграгарадкі і бульба, то гэта пра нас і будуць ведаць.

Андрэй Савіных дадаў, што Беларусь мае вельмі пазітыўны імідж у Паўднёва-Усходняй Азіі, Кітаі, Індыі, на Блізкім Усходзе, у Лацінскай Амерыцы:

— Гэта вялізныя рэгіёны свету, дзе пра нас пішуць або добра, або нічога. Не буду перабольшваць пазнавальнасць Беларусі ў гэтых краінах — зразумела, што большасць насельніцтва не ведае нас і, можа быць, не будзе ведаць ніколі. Але сацыяльна актыўныя праслойкі, звязаныя з палітыкай і глабальнай эканомікай, ведаюць Беларусь і ставяцца да яе з вялікай павагай.

Прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў адзначыў, што ўсе 7 мільярдаў чалавек на зямлі ніколі не будуць ведаць пра Беларусь, але такой задачы і не ставіцца:

— Мы самі павінны вызначыць мэтавыя аўдыторыі, краіны і рэгіёны, з якімі мы хочам больш актыўнага ўзаемадзеяння. Зыходзячы з гэтага і трэба думаць над тым, дзе мы павінны прыкласці больш намаганняў для павышэння пазнавальнасці краіны.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

НАВІНЫ

## КОНСУЛЬСКАЯ СЛУЖБА ВЯДЗЕ РАССЛЕДАВАННЕ Ў СУВЯЗІ З МАГЧЫМЫМ ЗАХОПАМ ПІРАТАМІ БЕЛАРУСА

Консульская служба вядзе адпаведнае расследаванне ў сувязі з інфармацыяй аб захопе піратамі беларуса паблізу Нігерыі. Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных.

Пры гэтым ён заклікаў не прыспешваць падзеі. «Мы сур'ёзна займаемся гэтым пытаннем. Да работы падключана Пасольства Беларусі ў Нігерыі. Мы пастаянна кантактуем з адпаведнымі службамі МЗС Расіі, і калі сітуацыя праясніцца, мы аб гэтым праінфармуем», — дадаў афіцыйны прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства.

Паводле звестак інфармагенцтваў, у тэрытарыяльных водах Нігерыі ў раёне горада Брас было ўчынена пірацкае нападзенне на буксір «Бурбон Ліберці 249», які належыць французскай кампаніі «Бурбон». Судна займалася абслугоўваннем марскіх платформ па здабычы вуглевадародаў на шэльфе каля паўднёвага ўзбярэжжа Нігерыі. Паведамлялася, што сярод захопленых — грамадзяне Расіі, Эстоніі і грамадзянін Беларусі.

**БЕЛТА.**

ПАДЗЕІ

## СЦЕРАЖЫСЯ МАХЛЯРА!

Жыхар Драгічынскага раёна, студэнт адной са сталічных ВНУ, трапіў у крымінальную гісторыю з-за сваёй неабачлівасці і даверлівасці. Да студэнта звярнуўся знаёмы з прапановай зарэгістраваць на сябе прадпрыемства. Хлопца запэўнівалі, што ён нічым не рызыкуе, а паслугу яго добра аплацяць.

Па сваім пашпарце студэнт зарэгістраваў прыватную фірму ў Мінску, адкрыў рахунак у банку. А праз пэўны час «новаспечанага прадпрымальніка» запрасілі ў падатковую інспекцыю і паведамілі, што за паўтара месяца на рахунак яго фірмы паступіла больш за тры мільярды рублёў, якія былі зняты наяўнымі. Ніякіх падаткаў з указанай сумы не было заплачана. А падатак складае сотні мільёнаў рублёў. І ўнесці яго ў казну павінен, як няцяжка здагадацца, студэнт, на чыё імя зарэгістравана фірма. Няведанне законаў не вызваляе ад адказнасці. Таму ў хуткім часе можа быць заведзена крымінальная справа ў дачыненні да хлопца.

У ходзе разбору справы гора-прадпрымальнік паведаміў, што яшчэ двое яго таварышаў трапілі ў такія ж сеткі сталічных прайдзісветаў. Махляры ўмела знаходзяць ахвяры сярод правінцыйных студэнтаў, якія хочуць зарабіць капейку. Маладыя людзі дэманструюць пры гэтым татальную прававую непісьменнасць і крайнюю неабачлівасць. І прыносяць сапраўднае няшчасце ў свае сем'і.

ФАКТЫ

## ТРАГЕДЫЯ НА ЎРОКУ

У Ганцавічах на ўроку памёр 14-гадовы вучань.

Дзевяцікласнік СШ №2 адчуў сябе дрэнна, потым страціў прытомнасць. Яшчэ да прыезду медыкаў яму спрабавалі аказаць першую дапамогу, але брыгада «хуткай» забрала хлопца ў стане клінічнай смерці. Падлетак быў дастаўлены ў рэанімацыю раённай бальніцы. Урачы каля гадзіны змагаліся за яго жыццё, але намаганні станоўчых вынікаў не прынеслі.

Паводле інфармацыі начальніка Ганцавіцкага раённага Следчага камітэта Андрэя Дзенісені, устаноўлена, што на хранічныя хваробы хлопчык не пакутаваў, траўмаў у той дзень не атрымліваў. Экспертыза пакуль не выявіла нейкіх анамалій. Такім чынам, прычына смерці вучня пакуль невядомая. Праверка па факце трагедыі працягваецца.

## ВЫПІЎ — НЕ САДЗІСЯ НА КАНЯ

Жыхар адной з вёсак Столінскага раёна пераязджаў вярхом на кані меліярацыйны канал і загінуў.

Паводле інфармацыі абласнога таварыства выратавання на водах, мясцовы жывёлавод вечарам вяртаўся дадому. Ужо непадалёку ад дома яму трэба было пераехаць меліярацыйнае збудаванне. Вершнік упаў у ваду, а выбрацца самастойна не змог. Пасля экспертыза ўстанавіла, што вясковец быў нецвярозы.

На жаль, гэта не адзінае няшчасце на вадзе, якое здарылася з людзьмі пасля ўжывання імі спіртнога. У верасні на вадаёмах Брэстчыны загінулі тры чалавекі. Усе яны былі нападпітку.

**Яна СВЕТАВА.**

**Внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО» (г. Минск, проспект Партизанский, 8) состоится 25 октября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8 в заочной форме**

Орган, по решению которого созывается общее собрание акционеров: Наблюдательный совет ОАО «Мотовело».

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении результатов закрытой подписки на простые (обыкновенные) акции ОАО «Мотовело».
2. Об утверждении решения о выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «Мотовело».
3. Об утверждении изменений и дополнений в устав ОАО «Мотовело».
4. Об утверждении цены выкупа простых (обыкновенных) акций ОАО «Мотовело» по требованию акционеров.

Бюллетени для заочного голосования акционеры получают 19 октября и 22 октября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «Мотовело», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00), под роспись при предъявлении паспорта (для представителей акционеров — паспорта и доверенности).

Акционеры обязаны возвратить заполненные бюллетени для заочного голосования по указанному адресу не позднее 17.00 22 октября 2012 г.

С проектом решений собрания, решения о выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «Мотовело», изменений и дополнений в устав ОАО «Мотовело», формой и текстом бюллетеня для заочного голосования акционеры могут ознакомиться 19 октября и 22 октября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «Мотовело», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00).

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «Мотовело» по состоянию на 18 октября 2012 г.

Выкуп акций по требованию акционеров производится по номинальной стоимости. Заявления от акционеров о выкупе акций по требованию акционеров принимаются 25 октября 2012 г.

*УНП 190017558.*

**30 октября 2012 г. в 12.00 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Лунинецлес»**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «Лунинецлес».
2. О переизбрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
3. О вознаграждении членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Местонахождение ОАО «Лунинецлес»: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Место проведения собрания: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 22.10.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНН 200251040 *Наблюдательный совет.*

У **суд Кобрынскага раёна** паступіла заява аб прызнанні памерлым **ДУДКІ Валерыя Іванавіча** 1964 г.н., ураджэнца Данецкай вобласці Украіны, пра якога няма ніякіх звестак з вясны 1994 года. Апошняе вядомае месца жыхарства Дудкі Валерыя Іванавіча: г. Кобрын, ул. Настасіча, д. 93, кв. 62.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Дудку Валерыя Іванавіча і яго месцазнаходжанне, паведаміць іх суду Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці на працягу 2-х месяцаў з моманту публікацыі.

## ПАНЯДЗЕЛАК, 22 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 18.45, 23.40** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.45** Вакол планеты.
**11.25** Журналісцкае расследаванне.
**12.15, 0.20 Драма «Гісторыя Антуана Фішэра».**
**14.25** «Майстар падарожжаў». «Балоння і правінцыя Эмілія-Раманья».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зорнае жыццё». «Вайна з прадзюсарам».
**16.30 Серыял «Містычныя гісторыі».**
**17.35** «Мая праўда». «Блестящие». Не ўсё тое золата, што блішчыць», частка 2-я.
**18.30** Камандзіроўка.
**19.40** Калыханка.
**19.55 Серыял «Мамачкі».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Форум.
**22.45 Серыял «Зорныя вароты. Першы атрад».**
**0.05** Дзень спорту.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Сардэчна запрашаем у Беларусь».
**12.05 Серыял «Няроўны шлюб».**
**13.10** «Час абедаць!».
**13.50** «Модны прыгавор».
**14.55 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**16.15 Меладрама «Аэліта, не чапляйся да мужчын».**
**18.20** «Адваротны адлік». «Лёс рэзідэнта. Аперацыя «Еўропа».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Адчынены фармат».
**22.10 Серыял «Закрытая школа».**
**23.15** «Вячэрні Ургант».
**23.50** «Без сведак».
**0.20 Серыял «Забойная сіла».**
**1.20** Начныя навіны.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.50 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45** Экстрасэнсы вядуць расследаванне.
**11.55 Маст. фільм «Восеньскія яблыкі».**
**13.00** Школа рамонту.
**14.10** Пад грыфам «Вядомыя».
**14.50, 22.40 Серыял «Деффчонки».**
**15.25, 21.30 Дэтэктыў «Міф пра ідэальнага мужчыну». 1-я серыя.**
**16.40** Беларуская часінка.
**18.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Авангард».
**21.25** КЕНО.
**23.15** Авертайм.
**23.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.05** СТБ-спорт.
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Вялікае снеданне».
**10.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Брэст.
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35, 18.30 «Слова жанчыне». Серыял.**
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Жыць будзеце».
**14.50** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**20.00** Сталічныя падрабязнасці.
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Маст. фільм «Залатое сячэнне».**
**22.20** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Слонім.
**22.55** «Пагаворым».
**23.10** «Тайны свету».
**0.05** «Пякельная кухня».

### МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**5.05, 6.05 Серыял «Вылячэнне каханнем».**
**7.05** «Цік-так».
**7.25** М/с «Прыгоды майстра Кун-фу».
**8.05, 9.05 Серыял «Сёстры па крыві».**
**10.05 Серыял «Усё ўключана».**
**11.05** «Разам».
**12.20** «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».
**13.20, 2.40 Маст. фільм «Аднойчы праз 20 гадоў».**
**15.25 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**17.05, 23.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**18.25** «Акцэнты».
**18.40** «Саюзнікі».
**19.20** «Усоды жыццё».
**19.50** «Сардэчна запрашаем».
**20.30** «Беларусь сёння».
**21.30, 4.25** «Свет спорту».
**22.05** Дак. серыял «У свеце сакрэтных ведаў».
**23.05** «Слова за слова».
**0.05, 1.05 Серыял «Камісар Наваро».**
**2.00** «Зроблена ў СССР».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 11.55, 18.55, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20, 14.35 Серыял «У надзеі на выратаванне».**
**8.10** «Кінаблакнот».
**8.30, 14.05 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».**
**9.00, 18.00 Серыял «Агенцтва «Месяцавае святло».**
**9.50** «Кулінарныя парады».
**10.15 «Сінематограф». Маст. фільм «Гісторыя кахання».**
**12.00 Маст. фільм «Каралеўства хрустальнага чэрапа».**
**15.30** «tut women tv».
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Мой любімы гадавалец».
**17.00 Серыял «Пляткарка».**
**19.00 Серыял «Мяжа».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Жыццё як цуд».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 19.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 18.30** «Гісторыі ў дэталях».
**9.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00** «Гэта маё дзіця».
**11.00** «Першыя пасля Алы».
**12.00, 17.00** Жаночая форма.
**12.30, 17.30** «Жанчыны не даруюць».
**13.00** «Усё пад кантролем».
**14.00** «Гарадское падарожжа».
**15.00** «Пагаслыя зоркі».
**15.30** «Горад жанчын».
**16.00** «Скажы, што не так?!»
**18.00, 19.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**21.10 Серыял «Геймеры».**
**22.10** «Не можа быць».
**23.10** «Па-за законам».
**0.00** «Што адбываецца?».
**0.30** Дэтэктыў «Шлюбнае чытво».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

